

# НЯПРОСТАЕ ВЫРАШЭННЕ «ПРОСТАЙ» ЗАДАЧЫ

## ААТ «Нярудпрам» шукае магчымасці не пакінуць сталіцу і Мінскую вобласць без нярудных будаўнічых матэрыялаў




У працоўным калектыве шмат маладых спецыялістаў. Сярод тых, хто паспяхова працуе на розных участках вытворчасці, — бухгалтар Ганна ХОДАР, эканаміст Святлана БЕНАРАДСКАЯ, намеснік галоўнага бухгалтара Юлія ТРАФІМАВА, вядучы інжынер-механік Максім ШЭЎЧУК, інжынер па якасці Аляксандра СКАЛАБАН, бухгалтар Алена ШПАКОЎСКАЯ, вядучы спецыяліст Сяргей КІРЫНОВІЧ.

З генеральным дырэктарам ААТ «Нярудпрам» Аляксандрам Лойкам з самага пачатку дамовіліся весці гутарку ў канструктыўным ключы — менш гаварыць пра тое, што, дзякаваць Богу, ужо зроблена, а засяродзіць увагу на рэзервах далейшага развіцця, нават на праблемах. Тым не менш кіраўнік палічыў неабходным падкрэсліць:

— Галоўная задача, якую вырашае калектыў, — забеспячэнне будаўнічага комплексу Мінска і сталічнай вобласці пяскамі розных гатункаў, шчэбнем, гравіем. Даём пяскі першага, другога і вышэйшага класа, будаўнікам яны неабходны пад розныя патрэбы. Калі першы і другі клас ідуць на падсыпку ці на «падушку» для дарогі, для аб'ектаў інжынернай інфраструктуры жылых дамоў і на іншыя мэты, то вышэйшы клас і тынковачныя пяскі ў першую чаргу ідуць для прыгатавання разнастайных тэхналагічных раствораў, для аддзелачных работ. Сёлета забяспечылі ўсіх сваіх спажыўцоў пяскамі вышэйшага класа.

Нават просты пералік арганізацый, якія ахвотна бяруць нашу прадукцыю, паказвае, што гэта сапраўды ўвесь будаўнічы комплекс — МАПІД, «Метрабуд», «Макрадар», «Мінскпрамбуд», «Мінскжалезабетон», усе КПД «Мінскбуда», усе будаўнічыя трэсты... Зараз знакаміты салігорскі будтрэст №3 узводзіць «Вялікі камень» і бярэ ў нас патрэбную яму гаму прадукцыі. Усе «Рамаўтадары». Трэст № 15 «Спецбуд». Асфальтавыя заводы. Пералік спажыўцоў вялікі.

І, як перад любым прадпрыемствам, стаіць задача атрымання на гэтай аснове прыбытку. Нашы людзі ганарацца сваім укладам у развіццё рэальнага сектара эканомікі і ў вырашэнне буйных сацыяльных праграм. Бо многія аўтастрады навокал беларускай сталіцы, цэлыя жылыя раёны Мінска ўзведзены ў тым ліку з нашых якасных матэрыялаў. Вось свежы прыклад. Вядзецца будаўніцтва першага этапу другой кальцавой аўтадарогі вакол Мінска. Усе памятаюць, што першы яе ўчастак адкрыў на пачатку кастрычніка Прэзідэнт. Гэта сведчыць пра важнасць аб'екта. Дык вось, пясок найвышэйшага класа на першы этап кальцавой пастаўляем мы, са сваіх драбільна-сартавальных заводаў «Мінскі» і «Крапужына».

**— Пытанне, без якога ўсё ж не абысціся: як ідзе выкананне прагнозных паказчыкаў?**

— Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва даводзіць нам чатыры асноўныя паказчыкі. Перш за ўсё, рэнтабельнасць продажаў — да канца года павінны на яе выйсці; паказчык энергазберажэння таксама будзе выкананы. Што тычыцца запасаў гатовай прадукцыі, то ў параўнанні з 2010-м ці нават 2012-м гадамі паказчык стаў больш жорсткім, вырас у два разы. На складах павінна быць не 40, як дазвалялася раней, а ўсяго 20 працэнтаў ад сярэднямесячнага аб'ёму. Вельмі разлічваем, што ўмовы надвор'я патрымаюцца спрыяльнымі для будаўнікоў, і яны гэтыя не такія ўжо вялікія запасы разбяруць. Спусціць іх, што называецца, па дэмпінгавых цэнах не можам: цэны і так невысокія. За імі праглядваецца дзяржаўная пазіцыя як міністэрства, так і калектыву, мэта якой — не ўплываць на кошт квадратнага метра жылля.

Суадносіны прадукцыйнасці і зарплаты — гэты паказчык даецца цяжэй за іншыя, яшчэ і таму, што ў канцы кастрычніка заказаў становіцца адчувальна менш, падае выручка. Тут зноў усё залежыць ад умоў надвор'я. Калі летась у снежні «за бортам» было плюс 10, то і вынікі гаспадарчай дзейнасці былі добрымі. Зараз усё робім для таго, каб гэты паказчык выканаць. Складана, бо адзін завод ужо закрываецца, з людзьмі даводзіцца развітвацца, а гэта псіхалагічна цяжэй за ўсё. Частку персаналу — найбольш вопытных, хто даўно ў нас працуе — пераводзім на іншыя заводы, папаўняем змены. Летась пасля выпрацоўкі радовішча мы на паўгода пакінулі людзей на дзве трэціх зарплаты, бо працавалі альбо з не поўнай нагрузкай, альбо наогул не працавалі. Але трымалі спецыялістаў, бо ведалі, што праз паўгода дадуць новае радовішча. Зямлю далі, і сёлета яны атрымліваюць больш за ўсіх, выпрацоўка — максімальная. Але той эксперымент паўтараць нельга, занадта дорага.

**— Калі творчая брыгада «Звязды» пабывала на ААТ «Нярудпрам» мінулы раз, у пачатку лютага 2013 года (тады публікацыя называлася «Задача «простая» — даць Мінску і сталічнай вобласці нярудныя будаўнічыя матэрыялы»), нам расказвалі як пра важную падзею пра нараджэнне новага драбільна-сартавальнага завода «Мінскі» — на той час была пушчана яго першая чарга.**

— Зараз пушчаны і працуюць усе тры чаргі ДСЗ «Мінскі» ў Лагойскім раёне. На гэтым развіццё не спынілася. Сёлета запусцілі чэшскую ўстаноўку, якая на адходах шламасховішча дае спецыфічны пясок вельмі дробнай фракцыі для падрыхтоўкі сухіх будаўнічых сумесяў. Шырока вядомая кампанія «Хенкель» (сусветны вытворца будаўнічых матэрыялаў) гатова забраць у нас увесь аб'ём гэтай прадукцыі.



Дырэктару драбільна-сартавальнага завода «Мінскі» Аляксандру МІНЦУ падабаецца размах работ. За яго спінай працуе сучасная мабільная сартавальная ўстаноўка.

Тэхнічны прагрэс не стаіць на месцы. На нашых радовішчах працуе некалькі перасоўных (мабільных) сартавальных установак. Па плане мадэрнізацыі сёлета павінны былі будаваць паўстацыянарны завод з поўнай прамыўкай прадукцыйнасцю 1 мільён кубаметраў нярудных матэрыялаў. А гэта быў бы значны прарыў у нашым развіцці. Будаваць павінны былі на новым радовішчы, якое аддалі іншым. Так што ўзвядзенне паўстацыянарнага завода, які ў выпадку вытворчай неабходнасці можна «перакінуць» на іншае радовішча, пакуль адкладваецца. А такія паўстацыянарныя прадпрыемствы — справа перспектыўная. Таму што стацыянарны завод стаіць на месцы, і калі радовішча выпрацавана, то сюды пачынаюць вазіць сыравіну з іншага. Але згодна з усімі методыкамі перавозка на адлегласць больш за тры кіламетры ўжо нерэнтабельная.

**— Што яшчэ вам удалося зрабіць для мадэрнізацыі вытворчай базы?**

— Калі браць гэты год, то набылі новую мабільную ўстаноўку. А да яе пагрузчык, і на падыходзе яшчэ адзін пагрузчык. І бяром яшчэ два горныя бульдозеры, якія выконваюць такія аб'ёмы работ, што іншай тэхніцы не па сілах. Яны дапамогуць нам павялічыць аб'ёмы рэкультывацыі. Завяршаючы работы на любым аб'екце, мы выконваем праграму грунтоўнай рэкультывацыі, у выніку лес зноў становіцца лесам, а поле — полем. Дзяржава нічога не страчвае, бо мы таксама дзяржаўнае прадпрыемства і дбаем пра напаўненне бюджэту.

Сёлета здадзім 80 гектараў пасля рэкультывацыі. І на наступны год столькі ж. Лічу, што ніхто іншы ў Беларусі столькі не здае.

**— Калі да вас на заводы і ў кар'еры прыходзіць новая тэхніка, то прыходзяць і новыя тэхналогіі?**

— Просты прыклад. Калі разглядаць звычайную стацыянарную сартавальную ўстаноўку, на якіх мы працавалі раней, і новую мабільную ўстаноўку, то яны не ідуць ні ў якае параўнанне. У першым выпадку для абслугоўвання на працягу сутак патрэбна дзесяць чалавек, у другім усяго тры. І не патрэбны затраты на падвоз сыравіны. Мабільная ўстаноўка працуе ў дзве-тры змены і акупляе сябе за год. Праўда, ёсць нюансы. Для мабільнай установкі пры нашых глебах складана рыхтаваць трывалыя пад'язныя шляхі. Патрэбна іх ці ўшчыльняць, ці цэментаваць. І круглы год яе выкарыстоўваць не будзеш, бо ў мінус 15—20 °С не заводзіцца, электроніка і гідраўліка пры нашых маразах не гатовы працаваць. Выхад бачым у мадэрнізацыі.

Так што, нягледзячы на ўсе складанасці пры адаптацыі найноўшых тэхналогій да нашых умоў, за імі будучыня. І мы гатовы ўкладваць сродкі ў далейшую мадэрнізацыю, у новыя тэхналогіі. Пытанне стаіць так: дзе гэта ставіць? Маці-прырода распарадзілася, што ўсе найлепшыя радовішчы пяску знаходзяцца пад раллёй ці пад лесам. І атрымаць іх пад распрацоўку няпроста. Патрэбна знаходзіць кансэнсус адразу з некалькімі інстанцыямі, якія не адразу хочуць разумець, што, па-першае, без нашай прадукцыі ўжо заўтра спыніцца выкананне ўсіх сацыяльных і наогул народнагаспадарчых праграм, якія «завязаны» на рабоце будаўнічага комплексу.



На месцы былога кар'ера пасля рэкультывацыі.

Некаторыя прыватныя прадпрыемствы парушылі найважнейшую ўмову землекарыстання, дзяржава мусіла наводзіць парадак, і пад «раздачу» ў пэўным сэнсе трапілі і мы. Бо ў выніку тэрмін выдзялення новых зямель пад распрацоўку радовішчаў павялічыўся, на гэта ідзе 3-4, а то і 5 месяцаў. Трымаць такі працяглы час людзей без зарплаты, нават на дзве трэці зарплаты, — гэта значыць страціць мільярды для бюджэту і спецыялістаў.

Набліжаецца канец года, і мы, як заўсёды, хутка звернемся да спажыўцоў з просьбай зрабіць заказ нашай прадукцыі на наступны год, з гэтага максімальна канкрэтнага партфеля заказаў будзе складацца бізнес-план прадпрыемства. Ён узгадняецца з міністэрствам, у выпадку неабходнасці будуць зроблены карэкціроўкі. Хутчэй за ўсё ў бок павелічэння. Мы не супраць, калі такія планы падмацоўваюцца прадастаўленнем фронту работ. Калі паглядзець на лічбы, то пятнаццаць гадоў назад прадпрыемства выпускала ўсяго 1 мільён 500 тысяч кубаметраў нярудных матэрыялаў (гэта была гадавая праграма). Па выніках 2014 года было ўжо 4,2 мільёна. Збіраліся выйсці на 5, але два заводы прастаялі без радовішчаў. Потым знізілі тэмп нашы спажыўцы-будаўнікі, і на гэты год мы, хутчэй за ўсё, выйдзем на 3 мільёны кубоў.

**— Аляксандр Анатолевіч, давайце высветлім пазіцыі па магчымай рэструктурызацыі вытворчасці. Радовішчы-мільённікі вычарпалі свой рэсурс і закрываюцца. Што замест?**

— З 1 кастрычніка гэтага года перастаў дзейнічаць драбільна-сартавальны завод «Заслаўе», закрываецца і кар'ер «Векшычы» там жа, бо радовішча цалкам выбрана. Мы звярталіся ў мясцовы райвыканкам і лясгас, каб нам дазволілі правесці геалагічную разведку зямель побач з заводам — мелася на ўвазе захаваць яго, хаця б таму, што пясок адсюль патрэбен і для другой Мінскай кальцавой дарогі. Але дазволу нам да гэтага часу не далі, бо землі там пад лесам першай катэгорыі. Лясгас у выніку пагадзіўся, а з райвыканкамам працягваецца перапіска. Пакуль што яны нам адказваюць, што не бачаць эканамічнай мэтазгоднасці. І ўсё ж завод пажадана захаваць яшчэ і таму, што тады мы зможам больш паспяхова забяспечыць будматэрыяламі само Заслаўе, якое з'яўляецца горадам-спадарожнікам сталіцы.

На супрацьлеглым баку сталіцы знаходзяцца кар'ер «Ванькаўшчына» і ДСЗ «Волма». Працуюць яны на адным радовішчы, стаяць там дзве ўстаноўкі. Выпрацуюць радовішча ў сакавіку, і ў сакавіку давядзецца закрываць яшчэ адзін завод, калі не будзе працягу на новым участку. Зараз узгадняюцца пытанні па суседнім кар'еры «Ленінскае», але на ім дробныя тынковачныя пяскі, якія патрэбны не ўсім спажыўцам. Там працуе невялікая ўстаноўка, якая не можа даваць дастаткова прадукцыі. А цяпер увага: увесь гэты комплекс з двух радовішчаў і завода забяспечвае буйную прамысловую зону «Шабаны», дзе шмат домабудаўнічых камбінатаў, асфальтавых заводаў і іншых будаўнічых прадпрыемстваў. Вось у чым складанасць і чаму нас турбуе лёс завода і абодвух кар'ераў. Калі перакрыем гэты вузел, спажыўцам нічога не застанецца, як ехаць на два нашыя заводы, што засталіся — ДСЗ «Мінскі» і ў пяці кіламетрах ад яго ДСЗ «Крапужына». Радовішчамі яны забяспечаны на год. Мы спрабавалі для завода-мільённіка «Мінскі» ўзяць яшчэ некалькі ўчасткаў на агульным радовішчы, каб устанавіць там паўстацыянарны завод. Але рабочая група па гэтым раёне зноў прызнала такое пашырэнне сыравіннай базы эканамічна немэтазгодным.

Такім чынам, агульная карціна такая: заводы закрываюцца, а новыя радовішчы выдзяляюцца ў крайне малых аб'ёмах. Менавіта гэтым перш за ўсё тлумачыцца «спаўзанне» паказчыкаў у рабоце з 4,2 мільёна кубоў да трох, а то і двух у недалёкай перспектыве.

Любое горназдабыўнае прадпрыемства, якім мы з'яўляемся, павінна ведаць свае перспектывы па сыравіннай базе на пяць гадоў наперад (так раней і было), каб дакладна планаваць работу і рыхтаваць вытворчую базу. Апошнім часам нам выдзяляюцца ўчасткі на год. Што можна спланаваць за год? І атрымліваецца так, што радовішчы закрываюцца фактычна ў адзін час, у адзін час закрываюцца заводы па іх перапрацоўцы, і пакуль будуць уведзены новыя, прастой непазбежны. Гэта абумовіць прастоі і сталічнага будаўнічага комплексу. Нам складана тлумачыць перспектыву такога калапсу ў розных кабінетах, але яна абсалютна рэальная.

У той сітуацыі будзе надзвычай складана, нават немагчыма ўтрымаць калектыў — а гэта спецыялісты, гарнякі — і знайсці ці падрыхтаваць новых.

Работы па разведцы радовішчаў мы праводзім працяглы час. Каля трох гадоў назад заплацілі вельмі вялікія сродкі на разведку для сваіх патрэб новых радовішчаў. Патрэбна было рыхтаваць базу для работы на гарадыспадарожнікі. А сёлета нам кажуць, што яно будзе перададзена іншай арганізацыі для будаўніцтва дарожнай развязкі ў Заслаўі.

Як толькі другая кальцавая дарога наблізіцца да Заслаўя, яны ўсё роўна мусяць вазіць матэрыялы з «Мінскага» і «Крапужына». А гэта за 40-50 кіламетраў. Можаце сабе ўявіць, які расход гаручага. Магчыма, нейкі аб'ём возьмуць у прыватніка, кар'еры якога размешчаны бліжэй, але такія аб'ёмы пяску найвышэйшага класа можам даць толькі мы.

Гэтыя прыклады сведчаць аб важнасці знаходзіць і асвойваць сыравінную базу для нашай вытворчасці побач з мегаполісам, гэта ў інтарэсах перш за ўсё нашых спажыўцоў, а значыць, у інтарэсах горада. Бо побач, гэта папершае. Па-другое, нашы цэны самыя нізкія ў параўнанні з іншымі пастаўшчыкамі пяскоў і іншых будматэрыялаў. Паколькі мы прызнаны манапалістамі, нашы цэны рэгулююцца дзвюма інстанцыямі. Камерцыйная цана — Мінгарвыканкамам, бюджэтная — Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва. У выніку на нашу прадукцыю дзве цаны, і яны адрозніваюцца адна ад адной. Мы б'емся, што называецца, каб крыху павялічыць кошт сваёй прадукцыі, але не знаходзім падтрымкі. Нам кажуць зніжаць затраты, што мы і робім за кошт унутраных рэзерваў, і ў нас ёсць рэальнае зніжэнне сабекошту прадукцыі. Але ў руднай прамысловасці моцна не разгонішся: вытворчасць складаная, стратная як па паліве, так і па электраэнергіі.

У гэтай сувязі таксама можна было б сказаць са старонак урадавай і парламенцкай газеты, што ў параўнанні з намі прыватныя горназдабыўныя прадпрыемствы, якія працуюць на тых жа тэрыторыях, даволі часта знаходзяцца ў больш выйгрышным становішчы. На наш погляд, усе павінны знаходзіцца як мінімум у аднолькавых умовах.

Тым не менш стараемся працаваць эфектыўна. Сёлета ні разу не стаялі — не было ні прастояў, ні пераходу на скарочаны працоўны тыдзень. Сёлета былі забяспечаны радовішчамі, і заводы працавалі. Шукаем рэзервы, адпускаем прадукцыю нават дарожнікам.

**— Кажуць, у таго, хто хоча працаваць, заўсёды багата праблем. Але ж у вас ёсць на каго абаперціся?**

— Сапраўды, мы як бы ў трох гаспадароў. Юрыдычны адрас у горадзе Мінску, значыць, гарадское падпарадкаванне. Кар'еры ў вобласці — і прамая залежнасць ад абласных інстанцый. А ў прамым падпарадкаванні знаходзімся ў Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, усе паказчыкі даводзіць нам міністэрства.

Стараемся знаходзіць агульную мову з усімі. Зыходзім з таго, што ўсе павінны разумець: мы выконваем дзяржаўную праграму.

Так ці інакш, але ўсе тры інстанцыі дапамагаюць. Мы ў даўгу не застаёмся. Кожны раз, калі атрымліваем новы руднік, даём гораду павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці, а значыць, і падаткаў, а вобласці — новыя працоўныя месцы. Бо працуем часта і ў дзве, і ў тры змены. Вобласці таксама дапамагаем машынамі на перыяд пасяўной і ўборкі ўраджаю, абласным дарожным арганізацыям — матэрыяламі. Па просьбах мясцовых жыхароў даглядаем дарогі, чысцім ад снегу, наладжваем дзяжурства бульдозераў і іншай тэхнікі...

Зусім хутка спыняецца яшчэ адзін завод, пра што мы гаварылі вышэй. І трымаць яго калектыў у 100 чалавек на дзве трэці зарплаты ніяк не выпадае.

І яшчэ. Пасля закрыцця двух заводаў на ўвесь Мінск мы зможам даць толькі каля 250 тысяч м$^3$ пяску вышэйшага класа — ці хопіць гэтага для будаўнічага комплексу сталіцы, сказаць не бяруся.

### Ці можна ігнараваць дзяржаўныя інтарэсы?

**Слова — начальніку вытворча-тэхнічнага аддзела Віктару ЯФІМЕНКУ:**

— Прадпрыемства функцыянуе з 1947 года. Закрывае 80 працэнтаў пастаўкі пяскоў, шчэбню і гравію на рынак Мінска і вобласці. Па аб'ёме выпуску прадукцыі на аднаго працуючага нашы паказчыкі не горшыя за еўрапейскія — 10 тысяч кубоў за год.

Пясок, як цэмент і шчэбень, з'яўляецца стратэгічнай сыравінай. Можна дапусціць закрыццё аднаго ці нават некалькіх заводаў КПД, — іх многа. Калі не будзе цэменту, пяску ці шчэбню, усё будаўніцтва проста стане.

«Нярудпрам» усе свае заводы будуе сам, ні рубля бюджэтных сродкаў не бярэ. Адзіная праблема — выдзяленне для дзяржаўных патрэб зямельных участкаў, за карыстанне якімі мы яшчэ і вялікія грошы заплацім.

Падкрэслю: для ДЗЯРЖАЎНЫХ патрэб.



Сорак пяць гадоў працуе Віктар ВАШКАЛАЙ электразваршчыкам на драбільна-сартавальным заводзе «Волма». Павіншаваць яго з гэтай датай сабраліся сябры па працы. Падарунак уручае старшыня прафкама Аляксандр МАСКВА.

**Кантакты ААТ «Нярудпрам»**
220024, г. Мінск, вул. Асаналіева, 72.
Фінансава-збытавы аддзел — тэл. 398-83-15.
e-mail — nerudprom@mail.by
УНП 100016844



Пагрузка пяску першага класа.

### Лічбы вачыма спецыяліста

**Начальнік планава-эканамічнага аддзела Вікторыя ЦЯЛЕБА:**

— Усё пазнаецца ў параўнанні. Для канкрэтнасці я прывяду некалькі лічбаў, параўнайце іх. На 20.09.2015 года пясок найвышэйшага класа за кубаметр у нас каштуе (з ПДВ) 57 004 рублі, а ў ААТ «Дарбудіндустрыя» — 81 894. Пясок другога класа: у нас 47 287, у іх 61 667. Гравій некаторых фракцый — розніца па цане у два разы!

З КУП «Мінскаблдарбудам» суадносіны па шчэбню асобных фракцый такія: у нас 89 221, у іх 160 043 рублі. Наша пясчана-гравійная сумесь каштуе 19 628, іх — 34 474 рублі.

Я прывяла свае так званыя камерцыйныя цэны, а дзяржаўныя, па якіх мы адпускаем большую частку прадукцыі, яшчэ ніжэйшыя. Вось і выжывай калектыву, як хочаш.

АД РЭДАКЦЫІ. У ходзе падрыхтоўкі матэрыялу пазіцыю кіраўніка актыўна падтрымалі намеснік дырэктара Мікалай Вількот, начальнік вытворчага аддзела Віктар Яфіменка, эканамісты, іншыя работнікі ААТ «Нярудпрам». Дзякуй ім за шчырасць.

Думаецца, што за пазіцыяй кіраўніка стаіць думка ўсяго калектыву ці большасці яго членаў.

А ад сябе дабавім вось што. Безумоўна, ёсць пэўная супярэчнасць паміж любымі прыродаахоўнымі і вытворчымі інтарэсамі. Яна існавала заўсёды. Але без своечасовага выдзялення зямлі таму ж «Нярудпраму» не абысціся: жыллё і дарогі будаваць патрэбна.

Не будзем забываць: руднік на месцы раллі таксама прынясе краіне мільярды рэальных грошай. Магчыма, не меншыя, чым ад паляводства.

Праз некаторы час тут зноў закаласіцца жыта, прырода атрымае сваё назад. Мы пра тое, што кансэнсус, гэта значыць разумны баланс зацікаўленасцяў розных ведамстваў, заўсёды шукаць варта, і чым хутчэй ён будзе знойдзены кожны раз, тым больш карысці для дзяржавы.

**Матэрыял падрыхтаваў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Здымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва прадпрыемства.**